FRONTEX

BELARUSIAN

# Ваша права падаць скаргу ў Frontex



# Вашы гуманітарныя правы і асноўныя свабоды

Вы маеце права на павагу сваёй фізічнай і псіхічнай недатыкальнасці, на годнае абыходжанне, на прытулак і адсутнасць дыскрымінацыі. Гэта адны з асноўных правоў, якія прызнаюцца еўрапейскім заканадаўствам.

Вы маеце права падаць скаргу, калі лічыце, што вашы асноўныя правы былі парушаны ў выніку дзейнасці Frontex, Еўрапейскага агенцтва памежнай і берагавой аховы.

Агенцтва дапамагае краінам-удзельніцам Еўрапейскага Саюза (ЕС) кантраляваць знешнія межы ЕС. У яго дзейнасці ўдзельнічае вялікая колькасць людзей: службовыя асобы, якія рэгіструюць вашы дадзеныя пры прыбыцці ў ЕС; супрацоўнікі, якія здымаюць вашы адбіткі пальцаў; перакладчыкі; кінолагі; супрацоўнікі аховы, якія суправаджаюць асоб, што вяртаюцца ў краіну паходжання; лекары і культурныя пасярэднікі. Усе гэтыя людзі абавязаны паважаць вашы асноўныя правы. У адваротным выпадку вы маеце права падаць скаргу ў Агенцтва.

# Хто можа падаць скаргу?

Вы можаце падаць скаргу, незалежна ад свайго ўзросту, калі вы ўпэўнены ў тым, што вашы асноўныя правы былі парушаны любой асобай, якая ўдзельнічае ў дзейнасці Агенцтва.

Вас можа прадстаўляць любая іншая асоба, юрыст або арганізацыя, якія могуць падаць скаргу ад вашага імя.

Вы маеце права падаць скаргу незалежна ад сваёй адміністратыўнай сітуацыі ў Еўропе (напрыклад, незалежна ад таго, ці ёсць у вас дзейсны дазвол на знаходжанне ў краіне або ці падаеце вы заяву аб прадастаўленні прытулку).

Калі адныя і тыя ж дзеянні паўплывалі на некалькіх чалавек, вы маеце права падаць скаргу сумесна.

## Як можна падаць скаргу?

Вы абавязаныя падаць скаргу ў пісьмовай форме і пазначыць свае кантактныя дадзеныя. Калі вы жадаеце выкарыстаць гатовую форму скаргі, яе можна знайсці на вэб-сайце Агенцтва, дзе яе тэкст апублікаваны на розных мовах. Вы можаце направіць скаргу ў выглядзе электроннага паведамлення або звычайнага ліста.

Вы павінны апісаць, якім чынам былі парушаныя вашы правы, якія менавіта правы былі парушаныя і ў якім месцы адбылося парушэнне. Вы можаце адправіць матэрыялы, датычныя да вашай скаргі, у любы момант. Агенцтва мае права звязацца з вамі для атрымання дадатковай інфармацыі.

Вы можаце направіць скаргу ў анлайн-рэжыме, у выглядзе электроннага паведамлення або звычайнага ліста:

**Інтэрнэт:**
https://frontex.europa.eu/fundamental-rights/complaints-mechanism/

**Эл. пошта:**
complaints@frontex.europa.eu

**Паштовы адрас:**
Frontex — Еўрапейскае агенцтва памежнай і берагавой аховы
Спецыяліст па асноўных правах
Plac Europejski 6
00-844 Warsaw, Poland
(Варшава, Польшча)

## Як працуе працэдура разгляду скаргаў?

Спецыяліст Агенцтва па асноўных правах вывучыць змест вашай скаргі і прыме рашэнне аб магчымасці яе разгляду. У адваротным выпадку вы, па магчымасці, атрымаеце інфармацыю аб іншых варыянтах разгляду вашай скаргі.

Існуюць асобыя крытэрыі для прыёму скаргаў. Вы можаце азнаёміцца з імі ў правілах Агенцтва ў датычнасці да скаргаў, якія знаходзяцца на вэб-сайце Агенцтва.

Калі ваша скарга падлягае разгляду, яе накіруюць Выканаўчаму дырэктару Агенцтва. Калі ў вашу справу ўцягнутыя супрацоўнікі

з краіны-ўдзельніцы ЕС, скарга будзе дадаткова накіравана ва ўпаўнаважаныя органы гэтай краіны-ўдзельніцы ЕС. Гэтыя органы нясуць адказнасць за перадачу высноў і справаздач Спецыялісту па асноўных правах, які затым праінфармуе вас аб выніках разгляду вашай справы.

Час, неабходны для разгляду справы, можа быць розным, у залежнасці ад яе асаблівасцяў. Аднак Агенцтва абавязваецца эфектыўна апрацаваць вашу скаргу і прыняць неабходныя наступныя захады.

Ваша асабістая інфармацыя (імя, кантактныя дадзеныя і г. д.) будзе перададзена кампетэнтным органам, але выключна пры наяўнасці вашай згоды. Яна не будзе апрацоўвацца ні ў якіх іншых мэтах, акрамя расследавання вашай скаргі.

Вы можаце адначасова падаць сваю справу і ў іншыя ўстановы, напрыклад, у нацыянальныя суды, якія таксама могуць дапамагчы ў абароне вашых правоў.

FRONTEX

Plac Europejski 6
00-844 Warsaw, Poland
T +48 22 205 95 00
F +48 22 205 95 01

frontex@frontex.europa.eu
www.frontex.europa.eu

© European Border and Coast Guard Agency (Frontex), 2023

Publications Office
of the European Union

FPI 23.0269

PDF:
TT-08-23-011-BE-N
ISBN 978-92-9467-867-6
doi:10.2819/424604